# ПАЛЫМНЕЮЦЬ НАД КРАІНАЙ СЦЯГІ ПЕРАМОГІ!



ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 16 (1052) ● Панядзелак, 6 мая 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆

**Ідзе па краіне радасны і светлы месяц май. Ён крочыць у святочных калонах дэманстрантаў, вітае нас са старонак газет у Дзень друку. Ён — у полымі вечнага агню, да якога прыйдуць у Дзень Перамогі сівыя ветэраны і моладзь, каб ушанаваць памяць загінуўшых герояў.**

**Сёлетні Першамай асаблівы. Толькі што закончыўся вялікі форум моладзі — XVII з'езд камсамола краіны. Ён прадэманстраваў непарушнае адзінства моладзі з партыяй і народам, імкненне юнакоў і дзяўчат яшчэ лепш працаваць на карысць Радзімы, іх пралетарскі інтэрнацыяналізм.**

**З вялікім уздымам жыхары гарадоў і вёсак нашай краіны рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўны Савет СССР. На сходах выбаршчыкаў кандыдатамі ў дэпутаты вылучаны лепшыя прадстаўнікі народа, камуністы і беспартыйныя.**

**Здавалася б, у гэтыя дні універсітэт жыве самымі звычайнымі клопатамі: рыхтуюцца да сесіі студэнты малодшых курсаў, заканчваюць дыпломныя работы выпускнікі, абараняюць дысертацыі выкладчыкі, правяраюць сваю працаздольнасць студэнцкія будаўнічыя атрады, праходзяць навуковыя канферэнцыі, выступаюць самадзейныя артысты. Але ва ўсім адчуваецца своеасаблівы ўздым.**

**Юнакі і дзяўчаты нашай вну імкнуцца высока несці сцяг флагмана беларускай навукі. Прайшоўшы Ленінскі залік у камсамольскіх групах паказаў, што ўзрасла грамадская актыўнасць камсамольцаў, палепшылася іх вучоба і дысцыпліна.**

**Цудоўны вясенні настрой, творчае натхненне, неабдымную чалавечую радасць нясе май савецкім людзям. Няхай жа будзе ён шчаслівым для ўсіх вас, дарагія сябры!**

☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆☆

**З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны стаў у рады абаронцаў Радзімы Дзмітрый Міхайлавіч Карулін. Ён быў удзельнікам баёў пад Ленінградам і Масквой, вызваляў Смаленск, малдаўскія гарады і вёскі, прайшоў з баямі па дарогах Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі.**

**За заслугі перад Радзімай Д. М. Карулін узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны II ступені.**

**На працягу 20 мірных год жыццё Дзмітрыя Міхайлавіча звязана з універсітэтам. Ён выконвае абавязкі прафесара кафедры глебазнаўства і геалогіі.**



**Сярод тых, хто вызваляў Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, быў і Віктар Нічыпаравіч Шкарупа. Баявое хрышчэнне ён прайшоў на Кубані, а затым змагаўся з ворагам на Украіне, удзельнічаў у баях за вызваленне Мінска, Баранавіч, Брэста і іншых населеных пунктаў Беларусі.**



## НА ПРЫКЛАДЗЕ СТАРЭЙШЫХ І СУЧАСНІКАЎ

Клопаты аб умацаванні магутнасці краіны, аб усебаковай падрыхтоўцы савецкіх людзей да абароны сацыялістычнай Радзімы былі і застаюцца аднымі з найважнейшых клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. І тут вялікае значэнне маюць пытанні выхавання, перш за ўсё моладзі, у духу савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, пастаяннай гатоўнасці да абароны заваёў сацыялізму.

Ваенна-патрыятычнае выхаванне заклікана фарміраваць у маладога пакалення марксісцка-ленінскі светапогляд, глыбокае разуменне палітыкі Камуністычнай партыі, ленінскіх прынцыпаў абароны сацыялістычнай Айчыны, выхоўваць высокую палітычную пільнасць, вострую нянавісць да класавых ворагаў.

Дзякуючы ваенна-патрыятычным мерапрыемствам моладзь прасякаецца духам глыбокай павагі да Савецкай Арміі і Ваенна - Марскога Флоту, далучаецца да вывучэння асноў ваенных ведаў, авалодвае практычнымі навыкамі ваеннай справы.

Ва універсітэце склаліся пэўныя формы ваенна-патрыятычнага выхавання. Адна з іх — фарміраванне высокіх маральна-палітычных

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**



## ВЯЛІКАЕ ДЗЯКУЙ!

Па традыцыі, як вялікае свята, адзначана 5 мая—Дзень друку. Шматлікая армія журналістаў, рабочых і сельскіх карэспандэнтаў, актывістаў насценнага друку правяла агляд сваіх сіл, ацаніла зробленае, намеціла планы далейшай актыўнай працы ў радах «рыцараў пяра». Менавіта дзякуючы ім не вычэрпваецца крыніца рознабаковых, цікавых, карысных, павучальных і захапляючых матэрыялаў, якія запаўняюць старонкі друкаваных выданняў і насценак.

Сёння рэдкалегія «Беларускага універсітэта» хоча падзякаваць і сваім сябрам, тым, хто дапамагае газеце аператыўна адклікацца на падзеі універсітэцкага жыцця, знаёміць чытачоў з цікавымі людзьмі, прапагандаваць вопыт выдатнікаў, лепшых груп і камсамольскіх актывістаў.

Вялікае дзякуй студэнтам факультэта журналістыкі Наташы Новікавай, Людзе Нікулінай, Тані Скібіцкай, Генадзю Марозаву, загадчыкам карэспандэнцкіх пунктаў: фізфака— Эльвіры Аляксандраўне Панкрацьевай і філфака — Вячаславу Васільевічу Каладзінскаму, намесніку дэкана біяфака Адаму Сямёнавічу Шуканаву, супрацоўнікам Мікалаю Цярэнцьевічу Нечыпарэнку, Давіду Раманавічу Прэсу, Галіне Аляксандраўне Раўновай, Ніне Панцеляймонаўне Якушавай, Еўдакіі Барысаўне Іванюценка і многім-многім іншым сябрам і актывістам друку!

Плённай вам працы, нягаснучай энергіі і спартыўнага здароўя, паўсядзённай актыўнасці, дарагія сябры!

**РЭДКАЛЕГІЯ.**

## 5 МАЯ АДЗНАЧАН ДЗЕНЬ ДРУКУ

АГЛЯД ДРУКУ

## І З ГУМАРАМ, І СУР'ЁЗНА

Газета «Бібліятэкар» — орган партыйнай і прафсаюзнай арганізацый бібліятэкі БДУ— па цікавасці і прыгажосці афармлення не ўступіць многім насценкам. Дзеля прыкладу возьмем нумар, прысвечаны спорту, здачы норм ГПА.

Позірк чытача спыняецца на яркіх дынамічных назвах: «На старт! ГПА. На старт!», «Прыступкі наверх», «Каляндар Лежабокі» і іншыя.

Кожны матэрыял суправаджаецца прыказкамі і прымаўкамі аб здароўі і маладосці. Дарэчы, аб маладосці.

— Калі я прыйшла да ўрача, ён быў уражан: «У вас сэрца, як у маладой жанчыны!» — расказвае старэйшы бібліятэкар К. П. Садоўская ў артыкуле «Сакрэт бадзёрасці і працаздольнасці» аб сваім адкрыцці фізкультуры, якая дапамагла ёй не ведаць ніякіх хвароб.

Сур'ёзныя парады арганічна спалучаюцца з гумарам. У газеце гэты раздзел называецца «Спартыўная фантазія». Камбінаваныя фотаздымкі супрацоўнікаў бібліятэкі з малюнкамі на тэму спорту не толькі ажывілі газету, але і надалі гэтаму нумару адценне арыгінальнасці.

Каб пераканацца ў тым, што добры спартыўны выпуск «Бібліятэкара» — не выключэнне, член рэдкалегіі Раіса Іосіфаўна Ляховіч паказала насценгазеты за мінулыя месяцы. І яны пакідаюць добрае ўражанне. Пачуццё такое, што ў калектыве бібліятэкі аб газеце клапоцяцца, хочуць бачыць яе цікавай, змястоўнай і дзейснай і прыцягваюць да яе творчыя сілы.

**С. МІКАЛАЙЧЫК.**

## НАСУСТРАЧ 30-ГОДДЗЮ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ



Ва універсітэце актыўна ідзе падрыхтоўка да 30-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Больш падрабязна з гераічнымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, эпізодамі баёў на франтах і ў партызанскіх зонах студэнты знаёмяцца на лекцыях па грамадскіх, агульнаадукацыйных і спецыяльных дысцыплінах, у час сустрэч і гутарак з удзельнікамі гераічных баёў на тэрыторыі рэспублікі.

У маі-чэрвені на ўсіх факультэтах, у вучэбных групах і аддзелах БДУ пройдуць лекцыі і даклады аб слаўных традыцыях савецкага народа, аб непарушных прынцыпах савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму.

У выхадныя дні і ў час канікул у паходы і на экскурсіі па месцах баявой славы адправяцца студэнцкія групы, каб аддаць даніну павагі гераізму і стойкасці барацьбітоў з фашызмам. Сотні юнакоў і дзяўчат прымуць удзел у спаборніцтвах па праграме спартакіяды народаў СССР, па ваенна-прыкладных відах спорту.

На факультэтах будуць абноўлены і створаны новыя стэнды і выстаўкі, прысвечаныя знамянальнай даце. Члены таварыства «Веды» выступяць у сталіцы рэспублікі і ў Мінскай вобласці з цікавымі лекцыямі.

Бяспрыкладнаму подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне будзе прысвечан кінафестываль мастацкіх і хранікальна-дакументальных фільмаў.

**М. МАЦЕЙКА.**

Супрацоўнікі аддзела абслугоўвання бібліятэкі разам з ваеннай кафедрай, саветам ветэранаў вайны праводзяць вялікую работу па выхаванню студэнцкай моладзі на традыцыях рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. Рыхтуючыся да 30-годдзя вызвалення Беларусі, яны правялі дыспуты па кнігах В. Быкава «Абеліск», «Дажыць да світання», Н. Кругавых «Дарога ў мужнасць», Г. Вароніна «На фронце зацішша», І. Падзерына «Камдзіў бессмяротных», Л. Арабей «Іскры ў попеле».

Актыўна выступаюць на дыспутах студэнты матфака, ФПМ, фізфака, хімфака А. Бялоў, В. Дзятлаў, В. Шчарбакоў, У. Марозаў, А. Барабан, І. Васільеў, М. Карніенка і іншыя.

Моладзь добра ведае пра баявыя подзвігі салдат, афіцэраў, партызан, пра іх смеласць і мужнасць. І выступленні юнакоў і дзяўчат на дыспутах і канферэнцыях прасякнуты пачуццямі захаплення прыкладамі стойкасці людзей старэйшага пакалення, жаданнем быць на іх падобнымі.

Зараз разам з актывам геаграфічнага факультэта рыхтуецца канферэнцыя па кнізе У. Е. Лабанка «Партызаны прымаюць бой». Запрошаны ўдзельнічаць у ёй Герой Савецкага Саюза, былыя ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.

**А. РУКШЫН,**
**загадчык аддзела абслугоўвання бібліятэкі.**

## ВЕТЭРАНЫ ЗАЎСЁДЫ Ў СТРАІ

Ва універсітэцкую арганізацыю ветэранаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў уваходзіць 350 чалавек: 287 франтавікоў, 63 партызаны і падпольшчыкі. Сярод іх — тры Героі Савецкага Саюза, кавалеры ордэнаў Леніна, ордэнаў Чырвонага Сцяга, ордэнаў Славы, узнагароджаныя медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

На кожным факультэце і пры агульнауніверсітэцкіх кафедрах створаны секцыі ветэранаў. Кіруе ўсёй дзейнасцю арганізацыі савет ветэранаў.

— Асноўны напрамак нашай работы, — расказвае сакратар прэзідыума савета ветэранаў Міхаіл Іванавіч Аносаў, — гэта выхаванне моладзі на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях.

За гэтымі словамі — сустрэчы ветэранаў са студэнтамі і школьнікамі, гутаркі ў падшэфных воінскіх часцях і з дапрызыўнікамі. Былым франтавікам, многія з якіх прайшлі ўсю вайну, змагаліся пад Брэстам і Сталінградам, вызвалялі Варшаву, Прагу, удзельнічалі ў бітве за Берлін, ёсць што расказаць маладым.

Работа арганізацыі засяроджваецца ў факультэцкіх секцыях ветэранаў. М. І. Аносаў адзначае актыўную дзейнасць секцыі фізічнага факультэта (старшыня М. І. Марэнка), юрыдычнага факультэта (Е. Ф. Плюта), факультэта журналістыкі (Г. З. Бягун). Вялікую грамадскую работу праводзяць ветэран грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Герой Савецкага Саюза Аляксандр Васільевіч Кірсанаў, старшыня прэзідыума савета ветэранаў, Герой Савецкага Саюза Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі, Герой Савецкага Саюза Мікалай Якаўлевіч Зайцаў, намеснік старшыні савета Аляксандр Саламонавіч Мізрахі і многія іншыя.

У перадмайскія дні адбылося пасяджэнне савета ветэранаў. Размова ішла аб падрыхтоўцы да святкавання 30-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Намечана арганізаваць выступленні ветэранаў на кожным факультэце, у падшэфных школах №№ 55, 46, 19, у музычна-мастацкай школе, у падшэфнай воінскай часці, правесці экскурсіі ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пад дэвізам «Ветэраны вайны расказваюць».

Грамадская работа стала для ветэранаў вайны неад'емнай часткай іх жыцця.

**Л. ЛАБАЧЭЎСКАЯ.**

# НА ПРЫКЛАДЗЕ СТАРЭЙШЫХ І СУЧАСНІКАЎ

(Пачатак на 1-й стар.).

якасцей у студэнцкай моладзі ў ходзе вучэбнага працэсу. Важнейшую ролю тут адыгрываюць грамадскія дысцыпліны. У мэтах ваенна-патрыятычнага выхавання выкарыстоўваюцца не толькі лекцыі, семінары, гутаркі, практычныя заняткі, але і падрыхтоўка студэнтамі курсавых і дыпломных работ, рэфератаў па ваенна-патрыятычнай тэматыцы.

Другая форма — правядзенне масавых ваенна-патрыятычных мерапрыемстваў: паходаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, сустрэч з ветэранамі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, удзельнікамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, героямі працы, тэматычных вечароў, мітынгаў і г. д.

Затым удзел студэнцкай моладзі ў розных формах ваенна-патрыятычнай работы грамадскіх арганізацый: камсамола, ДТСААФ, таварыства «Веды», Чырвонага Крыжа, спартыўных і г. д.; арганізацыя фестываляў ваенна-патрыятычных фільмаў, экскурсій у музеі, на прадпрыемствы; рэгулярнае правядзенне кросаў, спаборніцтваў па ваенна-прыкладных і тэхнічных відах спорту, падрыхтоўка і здача норм ГПА; рознабаковая ваенна-шэфская работа, арганізацыя сустрэч з воінамі Савецкіх Узброеных Сіл, маладымі афіцэрамі — выпускнікамі універсітэта, якія праходзяць службу ў войсках Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, ваенна-патрыятычная работа ў студэнцкіх будаўнічых атрадах. Іменна там удасканальваюцца палітычныя і арганізатарскія якасці студэнтаў, там яны праходзяць школу працоўнага і фізічнага гартавання. Арганізацыя ў час працоўных семестраў паходаў па месцах баёў злучэнняў і часцей Савецкай Арміі, сустрэч з ветэранамі рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў духоўна ўзбагачае і ідэйна загартоўвае студэнтаў.

Шырока выкарыстоўваюцца для ваенна-патрыятычнага выхавання перыядычны друк, насценныя газеты і наглядная агітацыя.

Успаміны ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і нарысы аб іх, апублікаваныя ў шматтыражнай газеце, пакідаюць глыбокі след у свядомасці моладзі.

Вялікую ўвагу пытанням ваенна-патрыятычнага выхавання стала ўдзяляць рэдкалегія «Весніка» БДУ.

Дзейсным сродкам стала арганізацыя выставак кніг, прысвечаных гераічным подзвігам савецкіх людзей, правядзенне канферэнцый чытачоў, дыспутаў, абсталяванне стэндаў (на фізічным, геаграфічным факультэтах, факультэце журналістыкі і іншых).

Важную ролю ў арганізацыі і правядзенні ваенна-патрыятычнай работы сярод студэнтаў адыгрываюць партыйныя і грамадскія арганізацыі факультэтаў. Вялікае выхаваўчае значэнне ў іх дзейнасці маюць мерапрыемствы, якія праводзяцца ў пазавучэбны час: індывідуальныя і групавыя гутаркі, сходы вучэбных груп, нарады актыву, арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва, спаборніцтваў па ваенна-прыкладных відах спорту, экскурсіі ў музеі і г. д.

Актыўна ўдзельнічаюць у ваенна-патрыятычнай рабоце дэканы факультэтаў. Многія з іх у гады Вялікай Айчыннай вайны былі ўдзельнікамі баёў, змагаліся на франтах ці ў саставе партызанскіх атрадаў. У правядзенні ваенна-патрыятычнай работы дапамагаюць створаныя на факультэтах сектары ваенна-патрыятычнай работы. У іх састаў уваходзяць прадстаўнікі партыйных бюро, камітэтаў камсамола і ДТСААФ, саветаў ветэранаў вайны факультэтаў.

Разам з тым неабходна адзначыць, што выкарыстоўваюцца пакуль не ўсе магчымасці. На асобных факультэтах ваенна-патрыятычная работа носіць эпізадычны характар. Яна яшчэ недастаткова цесна звязана з вучэбным працэсам, не заўсёды ўдзяляецца належная ўвага пазавучэбным формам работы. Асобныя камсамольскія арганізацыі не праяўляюць неабходнай ініцыятывы і настойлівасці ў арганізацыі спаборніцтваў па ваенна-прыкладных відах спорту, тэматычных вечароў з ветэранамі, паходаў. Значная частка студэнцкай моладзі яшчэ не прыцягнута да актыўнай абаронна-масавай работы ў спартыўна-тэхнічных гуртках і секцыях арганізацый ДТСААФ.

Набліжаецца 30-годдзе вызвалення Беларускай ССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта слаўная гадавіна будзе адзначацца як вялікае ўсенароднае свята і праводзіцца пад знакам далейшага ўмацавання непахіснай вернасці савецкіх людзей ідэям Леніна, справе камунізму, беражлівых адносін да рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый Камуністычнай партыі і народа, умацавання ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі.

Наш доўг—сустрэць гэтую слаўную гадавіну паляпшэннем ваенна-патрыятычнай работы, надаўшы ёй канкрэтны і мэтанакіраваны характар і прыцягнуўшы да яе ўсю студэнцкую моладзь.

**І. МАРЧАНКА,**
**кандыдат гістарычных навук.**









**Гэтыя хлопцы — будучыя фізікі, гісторыкі, філосафы, журналісты, філолагі. Але будзе ў іх і другая прафесія — абаронца Радзімы. І яны напружана рыхтуюцца да яе.**

**НА ЗДЫМКАХ: лекцыю «Аперацыя «Баграціён» чытае падпалкоўнік В. І. Піменаў; у час адпачынку на палявых занятках дасціпны жарт вельмі дарэчы.**

**Фота Д. ЧАХОВІЧА і М. ХАМЦА.**



*Шмат спраў у гэтыя дні ў агіткалектыва БДУ. Поўным ходам ідзе падрыхтоўка да выбарчай кампаніі.*

*НА ЗДЫМКУ: дзяжурны па агітпункту М. М. НІКІФАРЭНКА, інжынер кафедры радыётэхнікі і фізічнай электронікі ЗВЧ, і агітатары Д. А. ЦАРУК і С. І. МАКСІМАЎ, супрацоўнікі гэтай жа кафедры, правяраюць спісы выбаршчыкаў.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА



## СТУДЭНЦКАЯ ВЯСНА

Закончылася традыцыйнае свята армянскай моладзі «Студэнцкая вясна». Акрамя гасцей з Тартускага і Вільнюскага універсітэтаў, у ім прынялі ўдзел студэнты БДУ.

Народны ансамбль танца «Крыжачок» выступіў на святе з вялікай танцавальнай праграмай. У ёй былі беларускія, рускія і украінскія танцы, харэаграфічныя мініяцюры многіх іншых рэспублік. Аб поспеху «Крыжачка» гаворыць той факт, што выступленне нашых танцораў транслíравалася па тэлебачанню.

Затым студэнты беларускай дэлегацыі наведалі памятныя месцы старажытнага Ерэвана, агледзелі помнікі нацыянальным героям Арменії.

**І. ВІКТАРАЎ.**

## ПЯЮЦЬ «КВАЗАРЫ»

Думка аб стварэнні ансамбля нарадзілася даўно. Але думка думкай, а справа справай. І вось пачаліся пошукі музыкантаў. Крытэрыем у падборы людзей служылі не толькі музычныя даныя, але і чыста чалавечыя якасці.

Шмат людзей пабывала ў пакоі для рэпетыцый, састаў не раз змяняўся, і нарэшце мы спыніліся на тым, які цяпер носіць назву «Квазары» і з поспехам выступае на канцэртных пляцоўках рэспублікі.

Калектыў вельмі малады і па часу свайго існавання, і па ўзросту яго ўдзельнікаў. Рабяты сабраліся таленавітыя. Пішуць вершы, пішуць музыку. І таму ў праграме калектыву шмат сваіх песень. Напрыклад, Валянцін Пучынскі, студэнт II курса факультэта журналістыкі, піша песні і на грамадзянскія, патрыятычныя тэмы і песні лірычнага плана. Таленавітымі выканаўцамі з'яўляюцца і астатнія ўдзельнікі ансамбля: Тарас Дуюн, Мікалай Глазаў, Наталля Міцяніна, Сяргей Гаўрылюк.

У пачатку красавіка «Квазары» паказалі прэм'еру сваёй праграмы — вынікі ўпартай, штодзённай трохмесячнай работы. Зала вельмі цёпла сустрэла ансамбль і яго праграму. Асаблівым поспехам карысталіся песні ў выкананні Тараса Дуюна, Наталлі Міцянінай.

Немалую ролю ў поспеху калектыву адыграла дапамога рэктарата, парткома БДУ. Вялікія клопаты праявілі прарэктар А. Я. Малышаў, член парткома С. А. Лысенка, старшыня прафкома А. М. Жылінскі, старшыня праўлення клуба А. Фядотаў.

Адразу ж пасля выступлення ва універсітэце па прапанове абкома ЛКСМБ ансамбль выехаў з канцэртамі па Мінскай вобласці. Калектыў пабываў у пяці раёнах: Старадарожскім, Слуцкім, Любанскім, Салігорскім, Клецкім, і усюды гледачы цёпла сустракалі рабят. З вялікім поспехам прайшлі канцэрты ў Старых Дарогах, Любані, Салігорску і многіх калгасах і саўгасах вобласці. Усяго за тыдзень «Квазары» далі 11 канцэртаў на палявых станах, фермах, у дамах культуры, школах.

Цяпер ансамбль поўны творчых сіл. Мы рыхтуем новую канцэртную праграму, у якую увойдуць у большасці сваёй песні, напісаныя самімі ўдзельнікамі.

**У. ГІРЭНКА,**
**кіраўнік ансамбля «Квазары».**



**У інтэрнаце № 4 адбылася мастацкая выстаўка твораў студэнтаў-жывапіс, фотаработы.** **У экспазіцыі графіка, жывапіс, фотаработы.**

**На здымках Г. Павулі: «Партрэт брата» (масла, М. Бародка, юрфак); разьба па дрэву (Р. Саматыя, філфак).**



***

*Калі бывае дужа сумна,*
*Ці доўга не прыходзіць сон,*
*Я ўспамінаю ўсходы руні*
*І сіні-сіні ў полі лён.*
*Не гаварыце, не паверу*
*І не магу сабе ўявіць,*
*Што я магла радзіцца ў Перу,*
*Ці ў Аргенціне недзе жыць.*
*Чытаю кнігі пра Афіны,*
*Пра Крым, Маскву і ціхі Дон,*
*Пра Казахстан і Украіну,*
*А ноччу сніцца сіні лён.*

**Марыя ШЫМКО**

**ДАКОР**

Мы часта не цэнім, як трэба,
І час, і каханне, і дружбу,
Кавалачак чэрствага хлеба.
На працу ідзём, як на службу,
Адкладваем справы на заўтра,
Што сёння зрабіць было б можна.
І толькі спахопімся раптам,—
Як бачым, што й браца ўжо позна...







## ЧАМУ Ж МНЕ НЕ ПЕЦЬ?..

Вусная народная творчасць здаўна была для прафесійнага мастацтва багацейшай і невычэрпнай крыніцай эмацыянальнасці і ўзнёсласці. У ёй чэрпалі своеасаблівыя жыццёвыя рысы аўтары паэм і рамансаў, балетаў і песень. Не перастаючы быць народным скарбам, фальклор усё больш і больш пераходзіў на прафесійную сцэну, эстраду. Вялікую ролю тут адыгралі самі народныя выканаўцы, раўнівыя прапагандысты багатай фальклорнай спадчыны. Ленінскі лозунг «Мастацтва належыць народу!» яшчэ больш паскорыў і далей паглыбіў гэты творчы працэс. Выхад на прафесійную сцэну народных выканаўцаў, безумоўна, павінен быў нарадзіць і мноства новых праблем. Бо ён азначаў пераход ад адной формы бытавання мастацтва да другой, якасную змену не столькі выканання, колькі самога жыцця народнай песні. Бадай, адной з самых цяжкіх праблем было і няведанне законаў і патрабаванняў фальклору пры яго перанясенні. Здавалася, простая мелодыя, але пры выкананні яе на сцэне адразу адчувалася велізарная розніца паміж крыніцай і самім выкананнем. За знешняй прастатой хаваліся вялікая складанасць традыцыйнага існавання ў вуснай форме, няздольнасць да прафесійнай сцэны. Да таго ж, і эстрада мае свае законы, якія вельмі неспрыяльна адбіліся б пры механічным, «аўтаматычным» перанясенні фальклору на сцэну.

Законы эстрады прымусілі прыстасоўваць фальклор да новых умоў, узгадняць яго з патрабаваннямі часу. І ўсё ж калі 40—50-я гады не змаглі глыбока закрануць самую аснову песеннага мастацтва, то з'яўленне электрамузычных інструментаў, стварэнне вакальна-інструментальных ансамбляў, увядзенне ў іх склад, як асноўнай, ударнай часткі, стварыла неабходнасць далейшай апрацоўкі вуснай народнай творчасці.

Адной з важнейшых праблем бытавання фальклору ў наш час з'яўляюцца адносіны да песеннага мастацтва маладога пакалення. Ні для каго не сакрэт, што фальклорныя творы часцей за ўсё выконваюцца самадзейнымі фальклорна-этнаграфічнымі калектывамі, у складзе якіх звычайна людзі старэйшага ўзросту. А што ж будзе, калі асноўных носьбітаў фальклору не стане, хто возьме эстафету? Чаму, аналізуючы сучасны стан бытавання фальклору, сутыкаемся з абыякавасцю, мякка кажучы, маладзёжнай аўдыторыі і калектываў мастацкай самадзейнасці да народнай песеннай творчасці? Чаму нашчадкам крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў больш да спадобы якая-небудзь звышмодная эстрадная песенька, жыццё якой у лепшым выпадку вымяраецца 3—4 месяцамі? І справа тут не ў дрэнным мастацкім гусце. Варта прыгадаць, з якой любоўю і пашанай прыняты моладдзю такія жамчужыны, як «Касіў Ясь канюшыну», «Чорная Галка», «Калінка», «Рушнікі», «Лён». А ўсё таму, што гэтыя творы сугучны перажываннямі маладога сучасніка, што ў іх знайшло адлюстраванне сапраўднае пачуццё кахання, адбіліся адшліфаваныя часам народныя ўяўленні аб шчасці, вернасці. Яны былі вытрыманы, вынашаны ў сотнях сэрцаў, прасеяліся, адабраліся дзесяткамі лепшых выканаўцаў, перш чым стаць творамі народа. І ўсё ж няўжо дзевяць дзесятых песенных скарбаў так і застануцца ў фальклорных зборніках, будуць бытаваць у вузкім асяроддзі самадзейных артыстаў і спецыялістаў?

Мне думаецца, не ўмеем мы яшчэ даносіць народную творчасць да шырокага слухача. Часцей за ўсё асноўнай формай папулярызацыі народных твораў з'яўляюцца выступленні харавых калектываў, пераважна без музычнага суправаджэння. А наш імклівы час, наша бурнае жыццё патрабуюць—рытм і рытм. Таму, як ніколі, патрэбны музычныя апрацоўкі, стварэнне фальклорных вакальна-інструментальных ансамбляў, якія б у даступнай форме даносілі да нас песенную творчасць мінуўшчыны. Толькі яркая інструментоўка, беражлівыя адносіны да асновы арыгінала, максімальнае набліжэнне народных твораў да сучасных рытмаў, паступовае ўвядзенне электрамузычных інструментаў у склад аркестровай часткі можа даць плённыя вынікі. Дарэчы, вопыт у нас ужо ёсць. Прыкладам таму служыць вакальна-інструментальны ансамбль «Песняры». У мінулым самадзейны, малады калектыў здолеў узняцца на прафесійную сцэну, знайшоў сваю манеру выканання, свой стыль, узяўшы за аснову народную песню — невычэрпную крыніцу натхнення. Варта прыгадаць, што ў рэпертуары ансамбля звыш двухсот апрацовак народных песень і арыгінальных твораў.

Мы арганізоўваем кіналекторыі, распаўсюджваем абанементы на канцэрты класічнай музыкі, літаратурныя вечары, вучым разумець сур'ёзныя творы, але забываем, што і разуменне народнай песеннай творчасці патрабуе калі не спецыяльнай падрыхтоўкі, дык ва ўсякім разе добрага ведання асаблівасцей яе бытавання, жанрава-тэматычнай разнастайнасці. З другога боку, паўстае праблема: няма дзе студэнту пачуць народную песню. Зрэшты пытанне не столькі ў тым, каб пачуць народную песню, а ў тым, каб самому яе праспяваць, запомніць. Відавочна неабходнасць стварэння студэнцкіх харавых калектываў народнай песні. Менавіта ж сённяшнім студэнтам у будучым давядзецца несці зярняты мудрасці ў сваю школу, свой клас. Адзін толькі філалагічны факультэт можа пахваліцца сваім па сутнасці народным хорам, рэпертуар якога складзен выключна з фальклорных твораў. І, як паказалі выступленні хору, народная песня ўспрымаецца не горш, чым, скажам, «Вадаграй», «Увезу тебя я в тундру», «Мелодия». Трэба толькі смялей арганізоўваць такія калектывы, смялей эксперыментаваць.

**М. ПРЫГОДЗІЧ.**

## НА СВЯТА СЯБРОЎ

Па запрашэнню Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Эстонскай ССР у Таліне знаходзіліся кіраўнік народнай харавой капэлы БДУ Нона Уладзіміраўна Паляная і адна з лепшых танцавальных пар народнага ансамбля «Крыжачок» Галіна Цалавальнікава і Расціслаў Варэнік. Яны прынялі ўдзел у падрыхтоўцы да VI свята песні і танца вышэйшых навучальных устаноў Прыбалтыкі, якое адбудзецца ў г. Тарту ў ліпені. Свята прысвячаецца 50-годдзю прысваення ВЛКСМ імя У. І. Леніна.

Нашы прадстаўнікі развучылі некалькі эстонскіх народных танцаў і песень.

На свяце выступяць тры універсітэцкія калектывы: народная харавая капэла, народны ансамбль танца «Крыжачок» і народны аркестр народных інструментаў. Усяго ў Тарту паедзе каля 200 студэнтаў БДУ.

**І. ЯНКОЎ**





Напярэдадні Першамая ў БДУ праходзіў агляд факультэцкіх калектываў мастацкай самадзейнасці. З цікавымі праграмамі выступілі філолагі, юрысты, біёлагі, калектывы іншых факультэтаў.

**НА ЗДЫМКАХ:** дэманструюць сваё майстэрства артысты-аматары з геафака і факультэта журналістыкі.

Фота **М. Еўдакіменкі і Л. Ракаўца.**

# АДУКАЦЫЯ ЗА МЯЖОЙ

Шэраг замежных выданняў шматбакова асвятляе праблемы вышэйшай адукацыі і жыцця студэнцтва ў розных краінах свету.

Рэдакцыя шматтыражкі папрасіла загадчыка кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў Б. І. Бранавіцкага зрабіць анатацыю некалькіх часопісаў, прысланых ва універсітэт у апошні час.

***

Часопіс «ДЕ» («За дэмакратызацыю асветы»), № 2 утрымлівае інфармацыю аб вучобе студэнтаў у еўрапейскіх капіталістычных краінах, аб іх барацьбе.

Часопіс «ДЕ», № 3 прысвечан праблемам тэорыі, практыкі і за дэмакратызацыю асветы. У часопісе прыводзяцца даныя аб сацыяльным саставе студэнтаў ва універсітэтах капіталістычных краін Еўропы, аб незадаволенасці студэнтаў, іх становішчам ва універсітэтах, аб цяжкасцях, якія ўзнікаюць перад дзецьмі прадстаўнікоў ніжэйшых класаў пры паступленні ва універсітэт, аб палітычнай накіраванасці вучэбнага працэсу.

У часопісе таксама прыводзіцца інфармацыя аб месцы навукі ў капіталістычным грамадстве, у прыватнасці ў Даніі.

Паведамляецца таксама аб удзеле выкладчыкаў у развіцці вышэйшай адукацыі ў некаторых краінах сацыялістычнага лагера, у еўрапейскіх капіталістычных краінах, а таксама ў некаторых краінах Азіі.

аналізу універсітэцкай адукацыі. У якасці аб'екта даследавання ўзяты універсітэт у Венгрыі, універсітэты ў ЗША, універсітэт у Аўстраліі.

Прыводзіцца інфармацыя аб падрыхтоўцы кадраў у вну Румыніі, ГДР.

У заключным артыкуле часопіса расказваецца аб падрыхтоўцы прафесіянальных кадраў для прамысловасці ў Ірландыі. У гэтым артыкуле падкрэсліваецца, у прыватнасці, што ў цяперашні час «вывучэнне замежных моў не з'яўляецца інтэлектуальнай раскошай, а стала вострай неабходнасцю для ўсіх».

«News Service» («Служба навін»), № 17 расказвае аб злабадзённых падзеях грамадска-палітычнага характару. Часопіс прысвечан падзеям у Чылі. У артыкуле «Дэмакратыя патоплена ў крыві» апісваюцца мітынгі ў падтрымку патрыётаў Чылі ў краінах Еўропы, Лацінскай Амерыкі і Афрыкі.

У канцы часопіса прыводзіцца пасланне генеральнага сакратара Чылійскай камуністычнай моладзі Гладзіса Марына, у якім паведамляюцца дакументальныя даныя аб фашысцкім пераевароце ў Чылі, аб звяржэнні законнага ўрада Альендэ.

# У ВНУ КРАІНЫ

## АКЦЁРЫ І РЭЖЫСЁРЫ— СТУДЭНТЫ

«Інтэграл» — так называецца новы каляровы мастацкі фільм, зняты студэнтамі фізічнага факультэта. Гэта дэтэктыў, які апавядае аб перыпетыях шляху тых, хто жадае трапіць у студэнцкае кафэ. У фільме здымаліся трэцякурснікі — члены савета кафэ.

«Ленинский путь». Саратаўскі універсітэт.

## БУДАЎНІЧЫЯ РЫХТУЮЦЦА

**Студэнцкія будаўнічыя атрады Гомельскага універсітэта і Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту заключылі паміж сабой дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва і ўзялі высокія сацыялістычныя абавязацельствы. Яны разлічаны на падрыхтоўчы і рабочы перыяды. Акрамя вытворчай праграмы, імі прадугледжана шырокая агітацыйна-масавая, прапагандысцкая, выхаваўчая, ваенна-патрыятычная і шэфская работа, удзел ва Усесаюзным агітпаходзе студэнцкай моладзі і іншых мерапрыемствах.**

**«Гомельскі універсітэт».**

## ДЛЯ ЎЗАЕМНАЙ КАРЫСЦІ

Хутка лета, а з ім час вытворчых практык. Студэнты-географы ўжо ў чацвёрты раз паедуць на вытворча-азнаямленчую практыку ў ПНР. Як і ў мінулыя гады, рыхтуючыся да ад'езду ў брацкую краіну, студэнты знаёмяцца з эканомікай, прыродай Польшчы, сочаць за навінамі палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця ПНР.

«Харківський університет».

## ЗАПРАШЭННЕ НА ВЫСТАЎКУ

**У азнаменаванне 30-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў факультэт грамадскіх прафесій Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі арганізуе выстаўку работ самадзейных мастакоў і фотааматараў «Мір патрэбен усім».**

**«Савецкі студэнт».**

# ТРЭНЕР

Калі я ўпершыню сустрэўся з Яўгенам Рыгоравічам Стрэльнікавым, мяне ўразіў яго дапытлівы позірк. У ім было жаданне ведаць прычыны майго захаплення менавіта гэтым відам спорту, спроба вызначыць мае сілы і магчымасці. У адказ на яго пытанне «Значыць, хочаш займацца?» я, крыху збянтэжана, ціха адказаў: «Хачу». — Добра, прыходзь». Гэта прагучала, быццам: «Добра, праверым».

Так я стаў самбістам, а Яўген Рыгоравіч—маім трэнерам. Строгім, патрабавальным, няўмольным. Не, ён ніколі не прымушае нас займацца, ён проста дэманструе, што і як патрэбна рабіць. Ну, а мы самі працуем да знямогі, бо ведаем, што інакш ніколі не атрымаецца з цябе добры спартсмен.

Яўген Рыгоравіч заўсёды знаходзіцца побач з намі. Ён добра ведае характар кожнага, нашы фізічныя магчымасці, таму заўсёды правільна вызначае патрэбную нагрузку.

У Я. Р. Стрэльнікава немалы вопыт. Пачынаў ён з класічнай барацьбы, потым перайшоў на вольную, потым— на рухавае і імклівае самба. На першых усесаюзных спаборніцтвах па барацьбе самба, якія праходзілі ў 1954 годзе, ён заняў другое прызавое месца. У гэты ж час ён пачынае займацца трэнерскай работай. З 1959 года Яўген Рыгоравіч трэніруе студэнтаў БДУ. Сярод яго выхаванцаў адзін майстар спорту, два кандыдаты ў майстры, шмат першаразраднікаў.

Я добра ведаю, што, прыйшоўшы ў самы звычайны дзень на самую звычайную трэніроўку, атрымаю яшчэ адну часцінку яго спартыўнага вопыту, зраблю яшчэ адзін крок насустрач будучым перамогам.

**Г. ЖУРКО.**



Вясенняя Свіслач.

Фотаэцюд **Д. Чаховіча.**

# СПОВЕДЗЬ ЗАГАДЧЫКА КБ

Ідэя гэта прыйшла мне ў галаву зусім выпадкова. Працавала мая група нядрэнна, але неяк без агеньчыка. Рабяты падабраліся адзін да аднаго: сярэдні ўзрост 21 год, сярэдні бал у дыпломе 4,7. Увогуле, спецыялісты добрыя, але схільныя да захаплення.

Шурык — красворды сачыняе. Вася — па шахматах кандыдат у майстры спорту, Іван Васільевіч — радыёаматар, паўгода сістэму для тэлевізара рабіў. праўда, цяпер перадачы нават з Парыжа без перашкод прымае, а Федзя, той зусім... Адзін анекдот ведае — памрэш са смеху. Кіраваць такімі рабятамі, самі разумееце, цяжка. Калі разабрацца, у дзень яны гадзіны дзве працавалі, а астатні час фільмы абмяркоўвалі, імавернасць выйгрышу ў спортлато падлічвалі, а трое да гэтай пары французскую мову вучаць, можа, мінімум збіраюцца здаваць: у стол уткнуцца, толькі і чуеш: «...сюркул, мар'янс, мізэр...».

А калі ім усё гэта надакучыць, збегае хто-небудзь за газетай, і да канца рабочага дня рэбусы рашаюць і задачкі з рубрыкі «У часы адпачынку». Гледзячы, як яны гэтыя задачкі шчоўкаюць, сэрца крывёю абліваецца: з такімі рабятамі горы варочаць, ды што горы — дысертацыі пісаць, а яны задачкі...

Тут вось і ўзнікла ідэя. Пайшоў я ў рэдакцыю газеты і прапанаваў для рубрыкі «У часы адпачынку» задачу: «Разлічыць нізкачастотны ўзмацняльнік. Габарыты такія-та, параметры такія-та...» і далей усё па заданню.

На наступны дзень сяджу з ранку, як на іголках, ледзьве дачакаўся, калі рабяты за газету прымуцца. Красворд рашылі хутка, а затым за маю задачку ўзяліся. Паспрабавалі з наскоку рашыць — не выйшла. Тады яны да Васі кінуліся. «Кідай,— гавораць,— сваю нудоту! Тут задачка ў газеце знайшлася вельмі цікавая». А ў Васі тэхзаданне на гэты ўзмацняльнік ужо тыдзень пад шахматнай дошкай ляжыць.

Узяў ён газету, перачытаў два разы заданне. «Цікава, — замармытаў, — цікава!» І за лагарыфмічнай лінейкай пацягнуўся. І пайшла тут работа! За дзве гадзіны ўсё рашылі.

Я ж праз колькі дзён узяў гатовы праект, пайшоў у рэдакцыю і падкінуў ім наступнае заданне.

А нядаўна я свайго таварыша сустрэў. Таксама вельмі здольны чалавек, праўда, доктар навук, дырэктар НДІ. Дык ён гэтую гісторыю нават не даслухаў, адразу ў рэдакцыю газеты пабег задачу якуюсь прапаноўваць. Над ёй, гаворыць, некалькі НДІ ўжо пяць гадоў б'юцца.

**А. ТУЛАКІН,**
**студэнт фізфака.**

# ФІЗІКІ ЖАРТУЮЦЬ



## БЕСТОЛКОВЫЙ ЭТИМОЛОГИЧЕСКИЙ СЛОВАРЬ

АПЛОМБ (мед.) — зуб, из которого вылетела пломба.

БЕЗОБРАЗИЕ (фил.) — творческий кризис писателя.

БИОФИЗИК— бывший, исполнивший обязанности физик.

БОЛТУН (церк.)—язык колокола.

БРАНЬ — взятка.

БРАКОВКА—регистрация брака.

БАНКОВАТЬ (гангст.) — грабить банк.

ВИНИТЬ — напиваться.

ВОРКОВАНЬЕ (жарг.) — обучение воровству.

ВЕТРОГОН (техн.)—вентилятор.

ВОЛГАРЬ (автом.)—таксист.

КРЕМАЦИЯ (конд.) — намазывание кремом.

ОРАТОРИЯ — ссора в квартире с общей кухней.

РОГАЛИК — муж (пер. с франц.).

РЕЯТЬ (пиратск.)—вешать на рее.

СОФИСТ (иностр.) — биограф С. ЛОРЕН.

УМНОЖИТЬ (мещ.)—иметь квартиру, машину, дачу и т. д.

**Аспирант КУЛЬБА.**

## З НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ «АНТЫСМЕХАТРОН» І «ТЭРМАПАРА»

— Нават робат падскочыць, калі яму наступіш на любімы паўправаднік.

***

**— Ці можаце вы што-небудзь сказаць аб вялікіх фізіках XVII стагоддзя?**
**— Так. Яны памерлі.**

***

— Што большае: ядро ці атам?
— Абодва маленькія.

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ём — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Тыраж 2000 экз.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 11140

Зак. 598.